# Прадмова

Рэвізію Полацкага ваяводства 1552 года з поўным правам можна залічыць да гістарычных помнікаў, якія належным чынам яшчэ не ацэненыя нашай навукай. Спасылкі на Полацкую рэвізію мы сустракаем не так часта нават у спецыяльнай літаратуры, прысвечанай гісторыі Беларусі і Вялікага Княства Літоўскага XVI стагоддзя. Цяжка сказаць, што стала таму прычынай. Магчыма, справа ў тым, што рэвізію звычайна разглядаюць як крыніцу па сацыяльнай і эканамічнай гісторыі. Можа быць, прычынай таму стаў яе рэгіянальны характар. Аднак у рэчаіснасці значэнне Полацкай рэвізіі зусім не абмяжоўваецца пытаннямі гаспадарчага жыцця і сацыяльнай структуры насельніцтва. Тое самае можна сказаць і пра рэгіянальны характар апісання — нягледзячы на тое, што галоўным аб'ектам увагі рэвізораў было, безумоўна, Полацкае ваяводства, мы знаходзім у рэвізіі даволі шмат звестак па гісторыі іншых зямель Вялікага Княства Літоўскага. Ёсць тут і матэрыялы, якія датычацца суседніх дзяржаў.

Перш чым пачаць гаворку непасрэдна пра рэвізію, варта некалькі слоў сказаць пра эпоху і ўмовы, у якіх яна была створаная.

Пачынаючы з 1501 года, калі была адноўленая персанальная унія паміж Каралеўствам Польскім і Вялікім Княствам Літоўскім, гэтымі дзвюма дзяржавамі практычна ўвесь час аж да выгасання дынастыі Ягелонаў у 1572 годзе кіраваў адзін манарх. Спачатку гэта быў Жыгімонт I Стары, а потым яго сын Жыгімонт II Аўгуст. У два апошнія дзесяцігоддзі свайго доўгага кіравання Жыгімонт Стары (памёр у 1548 годзе) жыў пераважна ў Польшчы і мала займаўся справамі Вялікага Княства. А гэтыя справы часта вымагалі асабістага ўдзелу манарха. Без гэтага ўдзелу не маглі вырашацца многія, у тым ліку жыццёва важныя праблемы: ад гаспадарчых да ваенна-палітычных. І сітуацыя паказвала, што цэлы шэраг гэтых праблем сапраўды патрабаваў неадкладнага вырашэння.

У 1544 годзе на Берасцейскім сойме адбылася перадача ўлады ў Вялікім Княстве Літоўскім 24-гадоваму каралю і вялікаму князю Жыгімонту II Аўгусту. Жыгімонт I Стары захаваў за сабой толькі вярхоўную ўладу над Вялікім Княствам. Малады гаспадар энергічна ўзяўся за справу, і адным з яго першых мерапрыемстваў было правядзенне рэвізій гарадоў і цэлых зямель Вялікага Княства. Ужо ў 1545 годзе была праведзеная рэвізія ўкраінскіх замкаў: Уладзіміра, Луцка, Крамянца, Вінніцы, Брацлава і Житоміра. Адначасова апісваліся сёлы, якія належалі (*цягнулі*) да гэтых замкаў. Рэвізіі 1545 года з усёй відавочнасцю паказалі неабходнасць такіх мерапрыемстваў, бо стан замкаў аказаўся папросту катастрафічным[1]. Шчасце, што Вялікаму Княству ў гэты час не давялося весці абарончых войнаў на паўднёвым кірунку.

Справа не абмежавалася рэвізіямі замкаў. Жніўнем 1545 года датаваны інвентар Мядзельскай воласці, падрыхтаваны таксама па загадзе Жыгімонта Аўгуста[2].

---

[1] Гл.: Литовська Метрика. Книга 561: Ревізії українських замків 1545 року. Київ, 2005. С. 93—255.

[2] Документы Московского архива Министерства юстиции (далей — ДМАМЮ). Т. 1. Москва, 1897. С. 75—85.

Практыка складання рэвізій, трэба разумець, была прызнаная карыснай. У выніку на працягу 1550-ых — 1560-ых гадоў быў праведзены цэлы шэраг новых апісанняў зямель Вялікага Княства.

Новы этап рэвізійнай дзейнасці быў звязаны з правядзеннем у Вялікім Княстве Літоўскім зямельнай рэформы — памеры на валокі. Як вядома, першыя захады ў гэтым кірунку былі здзейсненыя каралевай Бонай Сфорца. У 1552—1555 гадах яна правяла валочную памеру ў сваіх пінскіх і клецкіх уладаннях. Матэрыялы гэтай рэформы (арыгінальная назва: «Рэестр памеры зямель на валокі») захаваліся і апублікаваныя[3]. Калі Піншчына перайшла пад кантроль непасрэдна дзяржавы, тут у 1561—1566 гадах па загадзе Жыгімонта II Аўгуста была праведзеная новая памера на валокі і, адпаведна, новая рэвізія зямель[4].

Рэвізія Жамойцкай зямлі 1555—1557 гадоў таксама была звязаная з валочнай памерай — там яе правядзенне пачалося акурат у 1555 годзе. На жаль, матэрыялы жамойцкай рэвізіі збераглiся толькі ў фрагментах[5].

Наступнай рэвізіяй, абумоўленай валочнай памерай, была рэвізія Гродзенскай эканоміі. Храналагічна яна ахоплівае 1558—1562 гады[6].

У 1560—1563 гадах была здзейсненая памера на валокі гарадоў Бранска і Суража, што на Падляшшы, а таксама прылеглых валасцей. Была складзеная і адпаведная рэвізія[7].

У 1563 годзе Дзмітрый Сапега па даручэнні караля правёў рэвізію Кобрынскай эканоміі[8], а ў 1566 годзе ён жа, *рэвізор яго каралеўскай міласці на Падляшшы*, склаў гаспадарчае апісанне Берасцейскага староства[9]. У сувязі з валочнай памерай у 60-ыя гады былі праведзеныя таксама апісанні (люстрацыі) украінскіх гарадоў і цэлых старостваў[10].

Рэвізіі ў Вялікім Княстве праводзіліся для апісання не толькі сельскагаспадарчых угоддзяў, паселішчаў і ўмацаванняў. Ад 1559 года да нас дайшоў вельмі спецыфічны і цікавы «Реистр списанья и выведанья пущ и переходов зверинных у… Великом Князстве Литовском»[11]. Гэта рэвізія дае ўнікальны матэрыял па лясной гаспадарцы краіны ў першай палове — сярэдзіне XVI стагоддзя.

---

[3] Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств, составленная пинским старостой Станиславом Хвальчевским в 1552—1555 г. Вильна, 1884.

[4] Писцовая книга бывшего Пинского староства, составленная по повелению короля Сигизмунда Августа в 1561—1566 годах пинским и кобринским старостой Лаврином Войной. Ч. 1—2. Вильна, 1874.

[5] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. 8. Вильна, 1870. С. 3—120. У публікацыі рэвізія памылкова аднесена да 1554 года.

[6] Писцовая книга Гродненской экономии. Ч. 1. Вильна, 1881. С. 3—588; Ч. 2. Вильна, 1882. С. 25—166.

[7] Там жа. Ч. 2. С. 317—522.

[8] Ревизия Кобринской экономии, составленная в 1563 году королевским ревизором Димитрием Сопегой. Вильна, 1876. С. 3—303.

[9] ДМАМЮ. Т. 1. С. 205—448.

[10] Гл.: Архив Юго-Западной России. Ч. 7. Т. 2. Киев, 1890. С. 42—363.

[11] Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем Великом Княжестве Литовском, составленная старостой мстибоговским Григорием Богдановичем Воловичем в 1559 году. Вильна, 1867. С. 1—62.

Побач з галоўнай функцыяй, кантрольна-гаспадарчым апісаннем, рэвізіі мелі і яшчэ адну важную мэту — праверку ўладальніцкіх правоў на маёнткі. Вось чаму ў рэвізіях дастаткова часта ўказваліся дакументы, на падставе якіх здзяйсняецца валоданне. Здаралася, складаліся цэлыя зборнікі копій такіх дакументаў[12]. Зараз яны ўяўляюць немалую гістарычную каштоўнасць.

Як відаць, рэвізіі ў Вялікім Княстве Літоўскім праводзіліся на працягу практычна ўсяго часу панавання Жыгімонта ІІ Аўгуста. Іх мэты былі рознымі, але гэта дзейнасць набыла шырокі размах і ахапіла практычна ўсю тэрыторыю дзяржавы. Прыгледзеўшыся да пераліку рэвізій, можна зразумець, што ў іх правядзенні назіраўся пэўны план і пэўная паслядоўнасць. Нярэдка складанне рэвізій даручалася тым самым асобам, якія мелі адпаведны досвед і, відаць, лічыліся спецыялістамі ў гэтай галіне. У большасці выпадкаў гэта былі ўраднікі рэгіянальнага ўзроўню (яны маглі займаць пасаду як у тым рэгіёне, дзе праводзілася апісанне, так і ў іншых), а таксама гаспадарскія дваране — шляхціцы, якія служылі пры двары караля і вялікага князя.

У 1551 годзе ў Вільні быў скліканы вальны сойм, дзе галоўнымі былі пытанні *абароны земскай*. Сярод іншага, было вырашана ўмацаваць старыя замкі і пабудаваць новыя. Адным з вынікаў сойма стала правядзенне шэрагу новых рэвізій, і галоўнымі аб'ектамі праверкі і апісання сталі замкі ўскраінных рэгіёнаў дзяржавы. Загаловак 6-й кнігі перапісаў Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага, дзе сабраныя рэвізіі ўкраінскіх замкаў, паведамляе, што гэты *попись замковъ… украинъныхъ* быў складзены *з росказанья господара его милости, короля и великого князя Жикгимонта Августа… лета отъ нароженья Божъего 1552, месяцовъ февраля и марта*. У ходзе гэтай рэвізіі былі апісаныя замкі: Чаркасы, Канеў, Кіеў, Жытомір, Луцк, Чарнобыль, Востр, Вінніца, Мазыр[13], Брацлаў, Крамянец[14], Бар[15], Уладзімір-Валынскі і Оўруч[16]. Як відаць, рэвізіяй былі ахопленыя практычна ўсе дзяржаўныя замкі поўдня краіны.

Усе рэвізіі складзеныя па адным плане. Галоўная ўвага засяроджаная на замку, стане яго ўмацаванняў і забеспячэнні ўсім неабходным. Апісаныя ўмацаванні: вежы, гародні, масты, іншыя замкавыя пабудовы, замкавыя службы, замкавыя сёлы, прыбыткі на старасту, пералічаныя мяшчане, путныя слугі. Часам коратка пералічаныя таксама шляхецкія і царкоўныя маёнткі. Увогуле, розныя замкі апісаныя з рознай ступенню падрабязнасці: гэта залежала, відаць, ад рэвізораў. Так, у выпадку з Чаркасамі і Каневам рэвізоры абмежаваліся апісаннем толькі саміх замкаў. Самай жа падрабязнай з'яўляецца мазырская рэвізія. У дадатак да

[12] Там жа. С. 63—212, 215—364.

[13] Апісанні гэтых дзевяці замкаў апублікаваныя ў: Архив Юго-Западной России. Ч. 7. Т. 1. Киев, 1886. С. 76—122, 141—183, 587—647.

[14] Апісанні Брацлава і Крамянца апублікаваныя ў: Архив Юго-Западной России. Ч. 7. Т. 2. С. 19—35.

[15] Архив Юго-Западной России. Ч. 8. Т. 1. Киев, 1893. С. 148—165.

[16] Описание книг и актов Литовской Метрики / Сост. С.Л. Пташицкий. Санкт-Петербург, 1887. С. 162.

дастаткова падрабязнага апісання замка і яго інфраструктуры тут змешчаныя таксама апісанні дзвюх замкавых валасцей: мазырскай і бчыцкай.

У адпаведнасці з агульным планам правядзення рэвізій ускраінных замкаў у 1552 годзе была складзеная і Полацкая рэвізія. Варта заўважыць, што акцыя ахапіла і іншыя раёны паўночнай і ўсходняй Беларусі. Так, у тым жа 1552 годзе былі праведзеныя таксама рэвізіі Віцебска з ваяводствам і Магілёва з воласцю. На жаль, гэтыя дзве рэвізіі вядомыя на сённяшні дзень толькі ва ўрыўках[17]. Але нават гэтыя фрагменты паказваюць, што ўсе тры рэвізіі праводзіліся аднастайна. Не выключана, іх рабілі тыя самыя людзі. І ў любым выпадку, існаваў пэўны план і каардынацыя працы рэвізораў.

Такім чынам, мы бачым, што ў 1552 годзе ў Вялікім Княстве Літоўскім была праведзеная маштабная акцыя па апісанні памежных умацаванняў. Яна ахапіла ўсю паўднёвую, усходнюю і паўночную мяжу дзяржавы ад Крамянца да Полацка.

З адзначанага зразумела, што Полацкая рэвізія 1552 года не была адзінай і ўнікальнай. Нягледзячы на гэта, яна займае асаблівае месца ў шэрагу пералічаных вышэй апісанняў. Пры параўнанні высвятляецца, што Полацкая рэвізія — самая падрабязная і інфарматыўная з іх, яна ахоплівае сваім апісаннем не толькі полацкі замак, але і ўсё ваяводства.

Рэвізоры Ян Кміта і Марцін Падсудкоўскі (у рэвізіі Подцендковский, Podcewski), канюшы троцкі, пазначылі ў якасці даты рэвізіі 9 сакавіка 1552 года. Спачатку быў апісаны горад Полацк: замак і *места*, якое складалася з пяці гандлёва-рамесных пасадаў. У замку акуратна пералічаныя ўсе вежы і гародні, а таксама асобы ці групы асоб, адказных за будаўніцтва і рамонт гэтых умацаванняў. Названая колькасць двароў у замку (130) і на пасадах (1487), а ўладальнікі зямельных участкаў і двароў на пасадах пералічаныя па імёнах. У асобную групу вылучаныя мяшчане, якія валодалі зямельнай уласнасцю на вёсцы і неслі з яе вайсковую службу. Таксама ў асобныя рубрыкі згрупаваныя казакі полацкага замка і панцырныя слугі Полацкага ваяводства, якія таксама былі прыпісаныя да замка, бо неслі ваенную службу. На замак неслі сваю службу і дзве катэгорыі сялян — псяры (псарцы) і «людзі прыгонныя». Замку належалі і дзве дзяржаўныя гаспадаркі (двары), якія існавалі на Полаччыне: Чэрсвят і Бельчыца. Да гаспадарскіх двароў былі прыпісаныя асобныя воласці і сёлы. Самую вялікую частку рэвізіі складае дастаткова падрабязнае апісанне зямельных уладанняў і сялянскіх дымоў полацкай шляхты. У гэтым апісанні абавязкова адзначана, колькі кожны шляхціц мусіў ставіць коней *ку службе земской*. У заключным раздзеле ў той жа манеры апісаныя маёнткі праваслаўнай царквы: архіепіскапа, манастыроў і цэркваў.

Назіранне над зместам рэвізіі Полацкага ваяводства 1552 года паказвае, што рэвізоры ставілі перад сабой адразу некалькі задач. Сярод найважнейшых было высвятленне абароназдольнасці і забяспечанасці ўсім неабходным галоўнага замка ваяводства — полацкага. Мяркуючы па ўсім, стан умацаванняў Полацка

[17] Документы, служащие материалом для истории белорусской церкви // Вестник Юго-Западной и Западной России. Т. 2. 1862. Кн. 4 (Октябрь). № 4. С. 16—21; Сапунов А.П. Витебская старина. Т. 1. Витебск, 1883. № 153. С. 341—343.

быў прызнаны нездавальняючым. Гістарычныя крыніцы сведчаць, што менавіта ў сярэдзіне — другой палове 50-ых гадоў XVI стагоддзя полацкі ваявода Станіслаў Давойна ўзяўся за рэканструкцыю і рамонт полацкага замка. Дзейнічаў ён рашуча, часта ігнаруючы інтарэсы і парушаючы правы мясцовых жыхароў. Гэта выклікала крыўду і шматлікія скаргі з боку полацкіх мяшчан і стала адной з галоўных прычын маштабнага канфлікту, які выбухнуў паміж мяшчанамі і ваяводам у 1558 годзе. Канфлікт разглядаўся самім гаспадаром і панамі-радамі. З адпаведных матэрыялаў высвятляецца, у прыватнасці, што Давойна загадаў павыкідаць з замка ўсе дамы. Гэтая мера была абумоўленая меркаваннямі супрацьпажарнай бяспекі: замак, як і ўвесь горад, быў драўляны. Па той жа прычыне Давойна забараніў мяшчанам трымаць у сваіх сядзібах лазні, а замест гэтага загадаў пабудаваць «лазню паспалітую» недалёка ад вады.

Да галоўных задач рэвізіі належалі таксама фіскальныя інтарэсы дзяржавы. Улік падаткаў, якія насельніцтва Полацкай зямлі несла на карысць дзяржавы, ваяводы і ўраднікаў мясцовай адміністрацыі, быў праведзены рэвізорамі з вялікай стараннасцю.

Нарэшце, для ўрада вельмі важнае значэнне мела апісанне зямельных маёнткаў прыватных уладальнікаў і царквы — з улікам сялян, якія ў гэтых маёнтках жылі. Справа ў тым, што вайсковая служба ў Вялікім Княстве Літоўскім была пастаўленая ў залежнасць ад землеўладання, а яе аб'ём вызначаўся ў адпаведнасці з колькасцю залежных сялян. Адзін вершнік выстаўляўся ад пэўнай колькасці сялянскіх «дымоў» ці «службаў». У сваю чаргу, гэтая колькасць вызначалася соймавымі ўхваламі. Ураду неабходна было ведаць, у якім аб'ёме землеўладальнікі (шляхта, мяшчане, царква) нясуць ваенную службу. Менавіта таму ў рэвізіі пры пераліку маёнткаў кожнага ўладальніка абавязкова адзначана, колькі вершнікаў ён павінен ставіць у войска. Прычым гэтыя звесткі падаваліся ў канцы кожнага апісання — у якасці своеасаблівага падагульнення. Гэтая акалічнасць яшчэ раз падкрэслівае той факт, што для ўрада першачарговую важнасць мелі звесткі менавіта аб ваеннай службе.

Полацкая рэвізія 1552 года вядомая гісторыкам ужо дастаткова даўно. Упершыню яна была апублікаваная ў 1880 годзе вядомым польскім гісторыкам Юзафам Шуйскім[18]. Шуйскі надрукаваў рэвізію па адзінай вядомай яму копіі, якая захоўвалася ў бібліятэцы графаў Браніцкіх у Сухой. Копія датуецца прыкладна сярэдзінай XVIII стагоддзя і ўяўляе транслітарацыю арыгінальнага кірылічнага тэксту лацінскай графікай. Спіс дэфектны: страчаныя заключная частка і яшчэ шэраг фрагментаў помніка. У цэлым тэкст рэвізіі перададзены ў гэтай копіі не вельмі дакладна, са значнымі скажэннямі і памылкамі ў назвах і лічбах. Памылковымі з'яўляюцца і некаторыя прачытанні публікатара.

Праз чвэрць стагоддзя з'явілася новае выданне рэвізіі, якое падрыхтаваў Іван Лапа[19]. У аснову гэтай публікацыя была пакладзеная іншая копія помніка, якая на пачатку XX стагоддзя зберагалася ў Ваенна-вучоным архіве Галоўнага штаба расійскай арміі. Гэта ўжо кірылічная копія, датаваная, згодна з вызначэннем

[18] Archiwum Komisji Historycznej. T. 2. Kraków, 1880. S. 175—247.

[19] Полоцкая ревизия 1552 года. Москва, 1905.

Лапы, канцом XVI — першай паловай XVII стагоддзя. Факсімільны здымак, змешчаны публікатарам, указвае хутчэй на XVII стагоддзе. Копія таксама дэфектная: адсутнічае пачатак і некаторыя іншыя фрагменты ў тэксце. Лапа не стаў абмяжоўвацца публікацыяй адной толькі новай копіі. У сваім выданні ён улічыў і копію з архіва Браніцкіх, падвёўшы рознačытанні і аднавіўшы па ёй фрагменты, страчаныя ў копіі Галоўнага штаба. Як вынік, публікацыя рэвізіі, падрыхтаваная Іванам Лапам, з'яўляецца на сённяшні дзень самай поўнай і найбольш дасканалай з пункту гледжання археаграфіі.

У XVI—XVIII стагоддзях рэвізія была запатрабаваная і выкарыстоўвалася для практычных патрэбаў. Невыпадкова менавіта тады былі зробленыя абедзве вядомыя на сённяшні дзень копіі помніка. Аднак, акрамя капіявання рэвізіі цалкам, практыкавалася і капіяванне асобных яе фрагментаў. Адзін з іх, датаваны другой паловай XVI стагоддзя, захоўваецца сярод матэрыялаў роду Корсакаў у Галоўным архіве даўніх актаў у Варшаве[20].

Можна назваць, прынамсі, два аб'ёмныя артыкулы, прысвечаныя спецыяльна рэвізіі. Аўтар першага з іх У.А. Паноў на падставе матэрыялаў помніка, у тым ліку статыстычных, паспрабаваў даць аналіз сацыяльнага ладу Полацкай зямлі[21]. Нягледзячы на шэраг выказаных трапных заўваг і назіранняў, гэты артыкул, аднак, выклікае нараканні з пункту гледжання методыкі даследавання. Апрача таго, ён у значнай ступені састарэў.

Матэрыялы рэвізіі пакладзеныя таксама ў аснову артыкула М.Ф. Спірыдонава, прысвечанага стану Полацкай зямлі ў сярэдзіне XVI стагоддзя[22]. У працы разгледжана ў асноўным сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёна, хоць закранутыя і некаторыя іншыя праблемы. На сённяшні дзень гэта, бадай, самае дасканалае даследаванне, выкананае на падставе рэвізіі. Сярод іншага, яно паказвае, які багаты матэрыял — у тым ліку статыстычны — дае помнік. Тым не менш магчымасці Полацкай рэвізіі як гістарычнай крыніцы яшчэ зусім не вычарпаныя. Засталіся цэлыя пласты інфармацыі, якія да сённяшняга дня яшчэ не знайшлі свайго руплівага даследчыка.

На момант складання рэвізіі Полацкае ваяводства ўжо аформілася як тэрытарыяльна-адміністрацыйная адзінка Вялікага Княства Літоўскага. Межы Полаччыны былі вельмі ўстойлівымі і мала змяніліся з часоў удзельнага княства. Ваяводства ляжала ў сярэднім цячэнні Дзвіны, па абодвух яе берагах. Менавіта Дзвіну і можна прыняць за ўмоўную мяжу паміж паўночнай і паўднёвай часткамі Полаччыны, якія прыкметна адрозніваліся паміж сабой. Паўночная частка была большай тэрытарыяльна, але значна горш заселенай. Паселішчы тут былі драбнейшымі і складаліся нярэдка ўсяго з некалькіх двароў. У плане ўрбанізацыі

[20] Archiwum Główne Akt Dawnych. Nabytki. Oddział III. Nr 283 (Korsakowie). S. 320—321.

[21] Панов В.А. Социальный строй Полоцкой земли по данным «Полоцкой ревизии 1552 года» // Журнал министерства народного просвещения. 1915. № 4. С. 209—263; № 5. С. 1—64.

[22] Спірыдонаў М.Ф. Полаччына: XVI стагоддзе // За передовую науку. 1990. 19 января, 26 января, 2 февраля, 9 февраля, 16 февраля. У новай рэдакцыі і пад крыху зменена назвай (Полаччына ў сярэдзіне XVI ст.) артыкул быў надрукаваны ў: Commentarii Polocenses Historici — Полацкія Гістарычныя Запіскі. Т. 1. Polociae Novae — Mensci, 2004. С. 5—19.

ў рэгіёне непадзельна дамінаваў Полацк, які быў галоўным горадам зямлі. Полацк быў яе найважнейшым замкам і найбуйнейшым гандлёва-рамесным цэнтрам. Іншых вялікіх гарадоў тут не было. Напярэдадні Лівонскай вайны на тэрыторыі Полацкай зямлі было ўсяго некалькі замкаў: дзяржаўныя Чэрсвят і Дрыса, а таксама прыватнаўласніцкія Друя (належала князям Масальскім) і Вята (уласнасць Івана Сапегі). Праўдападобна, існаваў у гэты перыяд таксама замак у Лепелі. Дарэчы, нават дзяржаўныя замкі па нейкіх прычынах не знайшлі свайго апісання ў рэвізіі. Не выключана, што яны былі апісаныя асобна. Таксама няшмат было на Полаччыне мястэчак. На сярэдзіну XVI стагоддзя іх удаецца налічыць усяго трынаццаць. Практычна ўсе гэтыя мястэчкі былі прыватнаўласніцкімі і размяшчаліся ў левабярэжнай, паўднёвай частцы ваяводства.

Рэвізія дае шырокія магчымасці для падлікаў насельніцтва тагачаснай Полацкай зямлі. Дарэчы, такія падлікі, як гэта ні дзіўна, яшчэ не праводзіліся. Былі толькі спробы ацаніць насельніцтва горада Полацка, аднак лічбы тут вельмі моцна вагаюцца. Усё залежыць ад характару звестак (пісьмовыя ці археалагічныя), іх паўнаты і, зразумела, ад методыкі падлікаў. Адразу ж трэба зазначыць, што сабраныя ў рэвізіі матэрыялы зусім не поўныя, на што ўказвае і сама крыніца. Гэта датычыцца і колькасці полацкіх двароў. Тым не менш гэтыя матэрыялы дазваляюць меркаваць, што ацэнкі насельніцтва Полацка ў некалькі дзясяткаў тысяч чалавек на сярэдзіну XVI стагоддзя — вельмі завышаныя. Рэвізія 1552 года налічвае на пяці пасадах «места Полацкага» 1 487 двароў і яшчэ 130 двароў у замку. Прымаючы каэфіцыент 7 чалавек на двор (сям'ю), атрымліваем, што ў адпаведнасці з лічбамі крыніцы, у сярэдзіне XVI стагоддзя Полацк меў блізу 11 300 жыхароў. Па той прычыне, што звесткі рэвізіі няпоўныя, гэтую лічбу можна павялічыць да 12–13 тысяч чалавек. Думаецца, такую ацэнку насельніцтва горада і трэба прыняць. Для тагачаснай Усходняй Еўропы Полацк быў вельмі значным горадам і, бясспрэчна, адным з найбуйнейшых у Вялікім Княстве Літоўскім. Крыніцы эпохі Лівонскай вайны параўноўваюць яго з Вільняй, а некаторыя з іх сцвярджаюць, што Полацк быў нават большым за сталіцу. На жаль, мы не можам сказаць на гэты конт нічога пэўнага, бо адпаведных матэрыялаў па Вільні за XVI стагоддзе не захавалася.

Адной з самых адметных рыс сацыяльна-эканамічнага ладу Полацкай зямлі было моцна развітае мяшчанскае землеўладанне. Частка мяшчан валодала цэлымі вёскамі з залежнымі сялянамі, і гэтыя вёскі былі раскіданыя ледзь не па ўсёй тэрыторыі ваяводства. Са сваіх зямель мяшчане неслі вайсковую службу нароўні са шляхтай. З ліку 366 коннікаў, якія павінны былі выстаўляць у войска ў 1552 годзе прыватныя землеўладальнікі (шляхта і мяшчане) Полаччыны, 49 коннікаў (13,4 %) былі мяшчанскімі. Такім чынам, полацкі мешчанін паўстае перад намі не толькі як гандляр ці рамеснік, але і як землеўладальнік-феадал, які за валоданне сваім маёнткам нясе вайсковую службу. Праўда, трэба зазначыць, што мяшчанскае землеўладанне ў Полацкай зямлі на працягу XVI стагоддзя хутка скарачалася — у асноўным на карысць шляхты.

Рэвізія згадвае каля сямідзесяці родаў мясцовай шляхты. Полацкая зямля належала да рэгіёнаў, дзе не было сваіх магнатаў і магнацкіх латыфундый. Пераважную большасць шляхты можна аднесці да дробнай і сярэдняй. На

агульным фоне сваім багаццем вылучаўся хіба што род Корсакаў. Гэты знакаміты полацкі баярскі, а потым шляхецкі род вядомы з канца XIV стагоддзя. Яго прадстаўнікі служылі яшчэ Андрэю Полацкаму. Корсакі захавалі свае пазіцыі на Полаччыне і ў пазнейшы час — аж да XIX стагоддзя.

Рэвізія фіксуе 7961 сялянскі «дым», пераважную большасць якіх (63 %) складалі сяляне-даннікі. Сялянская «даніна» магла быць рознай. Архаічнай формай, якая ўжо практычна адышла ў нябыт, была даніна мёдам. Такіх сялян налічвалася ўсяго 2,2 %. Затое вельмі шматлікай (51,3 %) была катэгорыя сялян-даннікаў, якія выплачвалі даніну збожжам. У Падзвінні, на Полаччыне і на Віцебшчыне, гэтая даніна традыцыйна складала «чацвёрты сноп», а адпаведную групу сялян тут называлі дольнікамі. Лічба сялян-дольнікаў пастаянна павялічвалася. Рост колькасці дольнікаў ілюструе працэс уцягвання падзвінскага рэгіёна ў міжнародны гандаль збожжам, а дакладней у яго вываз. І да сённяшняга дня ў нас застаецца пашыраным меркаванне, згодна з якім Падзвінне было адным з першых рэгіёнаў Беларусі, дзе з'явіліся і атрымалі найбольшае пашырэнне фальваркі. Статыстычны аналіз матэрыялаў рэвізіі паказвае, што гэта не так. Фальваркаў (панскіх двароў), якія арыентаваліся на вываз хлеба за мяжу, яшчэ нават у сярэдзіне XVI стагоддзя на Полаччыне было не так шмат. Мясцовая шляхта абрала зусім іншы спосаб атрымання са сваіх маёнткаў збожжа, якое, праўда, сапраўды прызначалася на экспарт. Пераважная большасць шляхты не стала заводзіць фальваркі, а галоўным спосабам атрымаць ад сялян хлеб зрабілася спагнанне непасрэдна з іх часткі вырашчанага ўраджаю — «долі». Менавіта перавагай такога спосабу атрымання шляхтай збожжа са сваіх маёнткаў і тлумачыцца вялікая колькасць сялян-дольнікаў на Полаччыне. Класічных жа цяглых сялян, якія працавалі на панскім полі, было тут няшмат — 7,5 %.

Даволі вялікую катэгорыю насельніцтва (12,2 %) складалі путныя слугі (іх яшчэ называлі баярамі). Гэты спецыфічны пласт насельніцтва займаў прамежкавае становішча паміж сялянствам і мяшчанствам. У адрозненне ад асноўнай масы сялян, путныя і панцырныя слугі неслі вайсковую службу. Гэтым і тлумачыўся іх дастаткова высокі сацыяльны статус, які набліжаўся да статуса мяшчанства. Аднак гэты сацыяльны пласт даволі хутка размываўся, і многія путныя слугі паступова былі пераведзены ў разрад сялян. Тым не менш на працягу яшчэ доўгага часу, і асабліва на мяжы з Расіяй, путныя слугі захоўвалі свой сацыяльны статус. Яны вылучаліся сацыяльнай актыўнасцю і рашуча адстойвалі свае правы. Менавіта дзякуючы гэтаму з уваходжаннем у склад Расійскай імперыі путныя і панцырныя баяры здолелі супрацьстаяць спробам урада перавесці іх у склад дзяржаўных сялян і дамагліся таго, што іх запісалі ў казакі.

Працягваючы гаворку пра структуру землеўладання, заўважым, што з трох яго формаў (дзяржаўнае, царкоўнае, прыватнае) на Полаччыне абсалютна пераважала апошняе. Дзяржаўных зямель было тут не так шмат. Варта адзначыць, што, мяркуючы па колькасці залежных сялян, другім землеўладальнікам у Полац-кай зямлі была праваслаўная царква. Гэты факт відавочна канфліктуе з пашыра-най думкай пра беднасць праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Дарэчы, рэвізія дае досыць багаты матэрыял па гісторыі царквы. Рэвізоры падрабязна

апісалі землі, якія належалі полацкаму архіепіскапу, манастырам і цэрквам. У гэтай групе землеўладальнікаў мы сустракаем манастыры і храмы не толькі горада Полацка. Тут ёсць таксама цэрквы, размешчаныя ў мястэчках ваяводства: Бабынічах, Галубічах, Туросе. У многіх выпадках мы даведваемся пра імёны царкоўных фундатараў, што таксама ўяўляе немалую цікавасць.

Асобнай і, на вялікі жаль, вельмі слаба вывучанай у нас праблемай з'яўляюцца шляхі зносінаў. Мы недастаткова ведаем пра фарміраванне і шчыльнасць сеткі дарог, пра іх будаўніцтва, рамонт, эксплуатацыю. Апісваючы павіннасці жыхароў той ці іншай вёскі, рэвізоры часта адзначаюць сярод іх абавязак *по дорозе... мосты мостить*. Некаторыя дарогі мелі ўласныя гістарычныя назвы: напрыклад, Слаўшчык — дарога, якая вяла ад Полацка на поўнач, у раён Асвеі і далей Себежа.

Шмат дае рэвізія і для краязнаўства. Многія населеныя пункты Полацкай зямлі згадваюцца тут упершыню.

Асобным аб'ектам вывучэння можа стаць мова помніка. Асабліва варта адзначыць багаты комплекс мясцовай антрапаніміі, тапаніміі, гідраніміі.

Па сутнасці, рэвізія 1552 года дае адначасовы здымак Полацкага рэгіёна, у якім фіксуе самыя розныя аспекты тагачаснага яго жыцця. У гэтым і палягае ўнікальнасць помніка, з моманту апошняй публікацыі якога прайшло ўжо больш за сто гадоў.

Гэтымі кароткімі ўступнымі заўвагамі, безумоўна, зусім не абяжоўваецца каштоўнасць рэвізіі і яе магчымасці як гістарычнай крыніцы. Удумлівы чытач знойдзе ў ёй яшчэ шмат цікавага — магчыма, нават таго, чаго яшчэ не заўважылі даследчыкі. Любая гістарычная крыніца невычэрпная і дае магчымасць кожнаму прылучыцца да гістарычнай творчасці.

У дадатку змешчаны фрагмент рэвізіі Полацкага ваяводства 1580 года — апісанне ўладычных, манастырскіх і царкоўных зямель, якое ў многім паўтарае звесткі рэвізіі 1552 года. І разам з тым рэвізія 1580 года дае каштоўны матэрыял для параўнання становішча полацкіх царкоўных зямель да Лівонскай вайны і на заключным яе этапе — у хуткім часе пасля таго, як Стэфан Баторый, прыклаўшы неверагодныя намаганні, адваяваў Полацк.

...У самы разгар працы над гэтым выданнем прыйшла трагічная вестка. У 36-гадовым узросце памёр адзін з яго сааўтараў гісторык Віктар Цемушаў. Віктар пачаў рыхтаваць карту і геаграфічны паказнік і з вялікім зацікаўленнем, упарта працаваў над імі літаральна да апошніх дзён жыцця, калі сілы ўжо пакідалі яго. На жаль, завяршыць іх ён так і не паспеў. Як не паспеў рэалізаваць і іншыя свае планы, звязаныя з распрацоўкай гістарычнай геаграфіі і гістарычнай картаграфіі Беларусі і суседніх краін. Аднак праца Віктара ў гэтым выданні ўсё ж была завершаная адным з яго калег. Ёсць спадзяванне на тое, што будзе мець працяг у беларускай навуцы і ўвесь той кірунак, яскравым прадстаўніком і энтузіястам якога ён з'яўляўся.

Усе мы, хто працаваў над гэтай кнігай, прысвячаем яе светлай памяці нашага калегі і сябра Віктара Цемушава (4.III.1975—23.VI.2011).

*Васіль Варонін*